9

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА
Гістарычны факультэт
Кафедра гісторыі Беларусі

Дапушчана да абароны
"02" 02 2015 г.
Загадчык кафедры
__________ А.М. Дулаў

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

# СІЯНІСЦКІ РУХ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX ст. – 1939 г.

Спецыяльнасць 1-21 80 16 "Айчынная гісторыя"

**Базарэвіч Ганна Хасеніеўна,**
магістрант

Навуковы кіраўнік:
**Дулаў Анатоль Мікалаевіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Віцебск, 2015

**Рэферат**

Магістарская дысертацыя 109 с., 7 мал., 2 табл., 108 крыніц, 3 дадаткі.

СІЯНІЗМ, ПАЛЕСТЫНАФІЛЬСТВА, КІБУЦНЫ РУХ, СІЯНІСЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯЎРЭЙСКАЯ ЭМІГРАЦЫЯ, РЭПРЭСІІ.

**Аб'ект даследавання** – грамадска-палітычнае жыццё на беларускіх землях з канца XIX ст. па 1939 г.

**Прадмет даследавання** – дзейнасць сіяніцкіх арганізацый на беларускіх землях.

**Мэта працы** – вызначыць асноўныя тэндэнцыі сіяніцкага руху на Беларусі у канцы XIX ст. – 1939 г.

**Метады даследавання**: аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, гісторыка-параўнальны, гісторыка-статыстычны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны.

**Элементы навізны.** Прадстаўленая магістарская дысертацыя з'яўляецца абагульняючым даследаваннем па гісторыі сіяніцкага руху на Беларусі ад з'яўлення першых сіяніцкіх гуртоў і да пачатку II Сусветнай вайны. Частка беларускіх зямель пасля заключэння Рыжскага міру ўвайшла ў склад Польскай Рэспублікі, што абумовіла адрозненні ў дзейнасці сіяніцкіх арганізацый. У працы адлюстраваны асноўныя вынікі параўнання сіяніцкага руху ў Савецкай і Заходняй Беларусі.

**Тэарэтычная і практычная значнасць.** Праца можа быць выкарыстана настаўнікамі, музейнымі супрацоўнікамі ў якасці датаковага краязнаўчага матэрыялу для факультатываў, у фарміраванні экспазіцый выстаў, музейна-педагагічных заняткаў і лекцый, якія раскрываюць поліэтнічнасць Беларусі і ролю этнічных супольнасцей у грамадска-палітычным, эканамічным і культурным развіцці.

ЗМЕСТ

СПІС СКАРАЧЭННЯЎ ........ 4

Уводзіны ........ 5

ГЛАВА 1. СІЯНІЗМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. ........ 16

1.1 Ідэалогія сіянізму і яе ўплыў на беларускіх землях ........ 16

1.2 Асаблівасці сіяністкага руху на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. ........ 21

ГЛАВА 2. СІЯНІСЦКІ РУХ У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1917–1930-я гг. ........ 32

2.1 Сіяніцкі рух на мяжы 1917–1920-х гг. ........ 32

2.2 Эвалюцыя сіяніцкага руху ў 1921 г. – 1930-я гг. ........ 42

ГЛАВА 3. СІЯНІСЦКІ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ........ 67

3.1 Развіццё сіяніцкага руху ў 1921–1926 гг. ........ 67

3.2 Сіяніцкі рух у 1926–1939 гг. ........ 76

Заключэнне ........ 82

Спіс выкарыстаных крыніц ........ 88

ДАДАТКІ ........ 99

**Уводзіны**

У сувязі з узрастаючай значнасцю дыпламатычных стасункаў, развіццём эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва Беларусі з дзяржавай Ізраіль бачыцца заканамерным рост цікавасці да гісторыі яўрэяў Беларусі, у прыватнасці да сіянізму – нацыянальнага руху, які ў канцы XIX ст. паставіў перад сабой мэту аб’яднання і адраджэння яўрэйскага народа на сваёй гістарычнай радзіме – зямлі Ізраіля. Гэтая ідэалагічная канцэпцыя мела лёсавызначальную ролю ў станаўленні яўрэйскай нацыянальнай дзяржавы.

З пачатку 1990-х гг. Рэспубліка Беларусь наладзіла сувязь з дзяржавай Ізраіль. Па дадзеных перапісу насельніцтва 2009 г. у Беларусі пражывае 12 926 яўрэяў, што складае 0,1 % ад агульнай кольскасці жыхароў краіны [52, с. 4]. У Беларусі арганізаваны Ізраільскі інфармацыйна-культурны цэнтр, Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, Саюз беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын, функцыяніруюць яўрэйскія школы, розныя грамадскія і рэлігійныя арганізацыі яўрэяў, выходзяць часопісы і газеты. У 2010 г. стартаваў значны выставачны праект “Гонар нацыі”, арганізаваны Амбасадай Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліке Беларусь і Беларускім таварыствам сяброўства і культурнай сувязі з краінамі замежжа, на якім былі прадстаўлены дакументы, фотаздымкі і матэрыялы пра выдатных яўрэяў, якія мелі беларускае паходжанне. Большасць з іх у свой час далучыліся да сіяністкага руху і спрычыніліся да будаўніцтва яўрэйскай нацыянальнай дзяржавы. Інтэнсіўнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і дзяржавы Ізраіль у сучаснасці прывяло да заключэння шматлікіх межурадавых пагадненняў пачынаючы ад усталявання дыпламатычных адносін і да супрацоўніцтва ў галінах навукі, адукацыі, культуры, турызму і інш.

Актуальнасць тэмы абумоўлена таксама неабходнасцю вывучэння сіяністкага руху на Беларусі для ўсебаковага асвятлення розных аспектаў грамадска-палітычнага развіцця краіны ў канцы XIX ст. – 1939 г. Правядзенне ўзважанай

этнакультурнай і канфесійнай палітыкі патрабуе ведання гісторыі этнічных супольнасцяў і іх узаемаадносін з дзяржавай.

**Мэта даследавання** – вызначыць асноўныя тэндэнцыі сіяніссцкага руху на Беларусі у канцы XIX ст. – 1939 г.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

- раскрыць сутнасць ідэалогіі сіянізму і перадумовы распаўсюджвання яго ідэй на беларускіх землях;
- вызначыць асноўныя накірункі дзейнасці сіяніссцкіх арганізацый у канцы XIX – пачатку XX ст.;
- ахарактарызаваць сіяніссцкі рух на Беларусі ў першыя паслярэвалюцыйныя гады;
- прасачыць эвалюцыю сіяніссцкага руху ў Савецкай Беларусі ў 1921–1930-я гг.;
- прааналізаваць развіццё сіяніссцкага руху на беларускіх землях II Рэчы Паспалітай у 1921–1939 гг.
- параўнаць асаблівасці сіяніссцкага руху ў Савецкай і Заходняй Беларусі.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца грамадска-палітычнае жыццё на беларускіх землях з кан. XIX ст. па 1939 г. **Прадмет даследавання** – дзейнасць сіяніссцкіх арганізацый на беларускіх землях. Храналагічныя межы даследавання абумоўлены з'яўленнем першых сіяніссцкіх гурткоў на беларускіх землях і пачаткам II Сусветнай вайны.

**Гістарыяграфія**. Гісторыя сіянізму прадстаўлена ў працах, прысвечаных яўрэйскай гісторыі ў спецыяльных тэматычных публікацыях айчынных і замежных даследчыкаў. Першую спробу акрэсліць гісторыю і ідэалагічныя асновы расійскага сіянізму здзейсніў дырэктар Дэпартаменту паліцыі ў Санкт-Пецярбурзе (1902–1905 гг.) А. Лапухін , вынікам яго працы стала запіска "Сионизмъ. Исторический очеркъ его развития" [55], у якой падрабязна апісваецца з'яўленне сіяніссцкіх ідэй у Еўропе, а пасля і ў Расіі, цытуюцца вытрымкі з гістарычных крыніц: статутаў і праграм

сіяніцкіх кангрэсаў, утрымліваліваюцца каштоўныя звесткі аб першым рэгіянальным раянаванні ў дзейнасці сіяніцкіх арганізацый, якое ахоплівала ўсе беларускія землі.

У савецкай гістарычнай навуцы распрацоўка тэмы дзейнасці сіяніцкіх партый і арганізацый на тэрыторыі Беларусі значна саступала даследаванням рэвалюцыйнага і беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Гісторыкі даследавалі ў асноўным праблемы, звязаныя з дзейнасцю камуністычнай партыі, таму атрымаць адзіную і аб'ектыўную карціну грамадска-палітычнага жыцця на беларускіх землях было складана.

У 1990-я гг. цікавасць да тэмы ўзрасла. Адным з заснавальнікаў беларускай іудаікі у постсавецкі перыяд з'яўляецца Э. Іофе [38; 39]. У сваіх кнігах і артыкулах ён неаднаразова звяртаецца да праблемы дзейнасці яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый на тэрыторыі Беларусі, прыводзіць важныя статыстычныя звесткі, аналізуе розныя бакі жыцця міжваеннага яўрэйскага грамадства. Даследчык Л.Смілавіцкі [91] надае ўвагу пытанням сіяніцкага руху, у тым ліку цкаванню сіяністаў, эміграцыі і пераследам. Гісторык базуецца на дэталёвым даследаванні архіўных дакументаў і літаратуры па дадзенай праблематыцы.

Шэраг навуковых артыкулаў даследчыцы яўрэйскай гісторыі на Беларусі І.Герасімавай прысвечаны сіяніцкаму руху на Беларусі. Яна правяла грунтоўнае даследаванне па гісторыі сіяніцкага з'езду ў Менску [19], асвятліла дзейнасць рэгіянальных сіяніцкіх арганізацый у Бабрйскай акрузе, які ўвайшоў у гісторыка-дакументальную хроніку "Памяць" па Бабруйскаму раёну [18].

Змястоўнымі з'яўляюцца даследаванні гісторыка, культуролага, публіцыста і грамадскага дзеяча яўрэйскай абшчыны ў Беларусі Я. Басіна "Большевизм и евреи" [4], які надае перавагу пытанням яўрэйскага жыцця ў Савецкай Беларусі.

Другі выпуск зборніка "Репрессивная политика Советской власти в Беларуси" [79] асвятляе шырокі спектр праблем і падзей XX ст. ва ўсёй іх складанасці і супярэчлівасці. У прыватнасці Я. Басін акрэслівае этапы складвання адносін

Савецкай улады да сіяніцкага руху, тлумачыць фармулёўкі абвінавачвання сіяністаў у БССР.

Дастаткова інфарматыўна дзейнасць сіяніцкіх арганізацый у Віцебску асвятліў краязнаўца А. Падліпскі ў сваёй працы “Евреи в Витебске” [75], матэрыялы якой склалі 2 тамы. Большую ўвагу А.Падліпскі надае дзейнасці арганізацыі “Хехалуц” у горадзе.

Абагульняючым выданнем сучасных даследаванняў па гісторыі сіяніцкага руху стаў зборнік навуковых прац “Российский сионизм: История и культура” [80].

Значную цікавасць да праблемы дзейнасці яўрэйскіх палітычных партый у міжваенны перыяд паказалі ізраільскія даследчыкі. Грунтоўнасцю характарызуецца праца “Сионистское движение в России” [58] гісторыка і публіцыста Іцхака Маора, які з’яўляўся непасрэдным удзельнікам сіяніцкага руху. Ён разглядае развіцце руху ў Расіі ад з’яўлення першых сіяніцкіх арганізацый да забароны дзейнасці сіяністаў пры Савецкай уладзе. У “Кароткай яўрэйскай энцыклапедыі” [51] шэраг артыкулаў прысвечаны зараджэнню яўрэйскага грамадска-палітычнага руху ў канцы XIX – пачатку XX ст., умовам фарміравання першых яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый. Аўтары энцыклапедыі таксама даюць характарыстыку розным плыням яўрэйскага палітычнага жыцця. Значную ўвагу складальнікі энцыклапедыі надалі асобным яўрэйскім палітычным арганізацыям, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР і ўсходніх ваяводствах Польшы з 1921 г. па 1939 г.

У 1960–1980-я гг. польскія даследчыкі практычна не разглядалі дзейнасць яўрэйскіх палітычных партый на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Аднак неабходна адзначыць шэраг прац, якія прысвечаны дзейнасці яўрэйскіх партый у Польшы ў перыяд 1921–1939 гг. Галоўным чынам гэта праца Е. Хольцэра “Палітычная мазаіка Другой Рэчы Паспалітай” [101]. У манаграфіі даецца падрабязны аналіз палітычнай структуры, якая склалася ў міжваенны перыяд у Польшы, прыводзіцца класіфікацыя яўрэйскіх партый па характары і зместу іх праграм. Падрабязна характарызуюцца кансерватыўна-клерыкальны, ліберальны сіяніцкі рух, а таксама партыі сацыялістычнай скіраванасці.

У 2004 г. была выдадзена манаграфія польскага гісторыка Я. Валканоўскага "Польска-яўрэйскія адносіны ў Вільні і Віленскім краі ў 1919–1939 гг." [108]. Аўтарам сабраны шырокі фактычны матэрыял пра паўсядзённае жыццё яўрэйскага насельніцтва Віленшчыны, умовы, у якіх яно праходзіла: грамадска-палітычная сітуацыя, надзеі яўрэйскай меншасці па пытаннях нацыянальна-культурнага самавызначэння, стаўленне розных польскіх палітычных арганізацый да яўрэйскага насельніцтва.

Грунтоўны аналіз яўрэйскай эміграцыі з Польшы ў 1937 г. правёў Станіслаў Паўлоўскі ў працы "O emigracji zydow z polski i o ich kolonizacji" [104]. Ен паслядоўна апісаў этапы і хвалі яўрэйскай эміграцыі ў краіны Заходняй Еўропы, ЗША і Палестыну, акрэсліў умовы і правілы, якія рэгламентавалі гэты працэс, вызначыў ролю сіяніцкіх ідэй і іх уплыў на працэссы эміграцыі з Польшы ў пач. 1920-х гг. – па 1937 г.

Належную ўвагу трэба надаць дысертацыі П. Стэцкевіча "Дзейнасць яўрэйскіх палітычных партый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1918–1926 гг." [91], дзе прадстаўлены комплексны аналіз дзейнасці яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі, вызначэнне ролі кансерватыўнага, сіяніцкага, ліберальнага і радыкальнага накірункаў яўрэйскага грамадска-палітычнага руху.

**Крыніцы**. Пры падрыхтоўцы даследавання былі выкарыстаны розныя крыніцы, якія магчыма сістэматызаваць наступным чынам:

1.***Працы тэарэтыкаў сіянізму і праграмныя дакументы.*** Працы Т. Герцля – заснавальніка ідэалогіі палітычнага сіянізму – "Еврейское государство" [21], "Полное собрание речей и статей о сионизме" [22] даюць уяўленне пра сутнасць ідэй сіянізму, яго мэты і каштоўнасці. Сіяніцкія ідэі з цягам часу афармляліся ў розныя плыні: духоўны сіянізм, аўтанамізм, тэрытарыялізм. Працы ідэолагаў гэтых накірункаў Ашэр Цві Гінзберга вядомага як Ахад-ха-Ам (іўр. "адзіны з народа") і Шымона Дубнова з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гэтаму пытанню [33; 88].

“Базэльская праграма” [7], прынятая на I Сусветным сіяніснкім кангрэсе ў 1897 г. карысна для дакладнага ўсведамлення ідэалагічных канцэпцый і мэт сіянізму ў той форме, якая была прадстаўлена і беларускім яўрэям. Адной з ключавых падзей было абвяшчэнне “Дэкларацыі Бальфура” [8], бо менавіта ад брытанскага ўрада залежыла выкананне асноўных пунктаў “Базэльскай праграмы”.

2. ***Заканадаўчыя дакументы.*** Дзейнасць сіяніцкіх арганізацый на беларускіх землях рэгламентавалася законамі і нарматыўна-прававымі актамі. Тэзісы Цыркуляра Дэпартамента паліцыі асобнага аддзялення Міністэрства Унутраных спраў, якое ўзначальваў В. Плеве № 6142 “О сионизме и национальном еврейском движении” [72], упершыню на дзяржаўным узроўні забаранілі дзейнасць сіяніцкіх арганізацый. Наступны Цыркуляр, які вызнаваў усё сіяніцкія арганізацыі забароненымі быў выдадзены 6 чэрвеня 1907 г. [73]. Канстытуцыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 1919 г. [41] і Канстытуцыі БССР 1927 г. [46] і 1937 г. [45] вызначалі правы нацыянальных меншасцяў у краіне, Заканадаўства РСФСР, у прыватнасці Крымінальны кодэкс [24], артыкулы якога рэгламентавалі фармуліроўкі абвінавачванняў супраць членаў сіяніцкіх арганізацый, Рыжская мірная дамова [32] вызначала стан былых падданых Расійскай імперыі як польскіх грамадзян.

3. ***Матэрыялы справаводства.*** Фонды архіваў Беларусі ўтрымліваюць карысныя дакументы, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра сіяніцкі рух на Беларусі. Намі былі скарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (фонд Канцылярыі Мінскага губернатара) [72; 73; 74], якія дазваляюць прасачыць стаўленне ўладаў да сіяніцкага руху ў часы Расійскай імперыі, а таксама Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (Ф. 4п – Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (1918–1941 гг.) [68; 69; 70; 71], Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (Ф. 10050п – Віцебскі Губернскі камітэт РКП(б) [26; 27; 28; 29; 30], якія даюць магчымасць даследаваць барацьбу партыйных і дзяржаўных органаў супраць іудаізму, яўрэйскай народнай і нацыянальнай адукацыі, сіяніцкіх арганізацый і суполак, незалежных грамадскіх, дабрачынных і

культурна-асветніціх арганізацый. Архіўныя фонды савецкага часу утрымліваюць таксама праграмы, агляды, пратаколы і цыркуляры пасяджэнняў сіяністкіх арганізацый Беларусі, якія дазваляюць прааналізаваць іх стратэгію і тактыку.

Справаводчую дакументацыю магчыма падзяліць на наступныя групы: *арганізацыйна-распарадчая дакументацыя.* Да гэтай групы адносяцца Устаў і агульныя палажэнні Адзінай Арганізацыі Сіяністкай Моладзі [68, арк. 6–10], якія былі прынятыя на аб'яднаным паседжанні ЦК Арганізацыі сіяністкай моладзі "Хе-хавер" і Арганізацыі сіяністкай моладзі "Гістадрут", у якіх падрабязна акрэслены задачы руху, накірункі працы, пазіцыя ў сусветным сіяністкім руху.

Да арганізацыйна-распарадчай дакументацыі адносяцца таксама пастановы, рэзалюцыі, цыркуляры, звароты, распараджэнні і інструкцыі, якія рэгламентуюць дзейнасць сіяністкіх арганізацый. Сярод найважнейшых дакументаў можна назваць Цыркуляр Мерказа (Цэнтра) сіяністкай моладзі аб арганізацыі агульнай мадэлі паводзін ва ўмовах пераследаў [68, арк. 10–11] і зварот да бюро Яўсекцый пры губернскіх камітэтах [26, арк.96], якія паказваюць неадназначнае стаўленне да сіяністкіх тэндэнцый у яўрэйскім асяродку.

Рэзалюцыі і пратаколы да канферэнцыі сіяністкай арганізацыі "Хе-хавер" адлюстроўваюць рашэнні бягучых пытанняў, штодзённы практычны бок працы, формы яе арганізацыі і праблемы ў руху. Дакументы маюць справаздачны характар, утрымліваюць статыстычныя звесткі. Аб палажэнні прыхільнікаў сіяністкіх ідэй ў Вільні напачатку II Сусветнай вайны сведчаць дакументы, канфіскаваныя ў Барэнштэйна Абрама-Ізраіля Іцкавіча – кур'ера Віленскага цэнтра "Хашамер Хацаір" у 1940 г. [71].

Грунтоўная праца па збору крыніц праведзена спецыялістамі Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі. Фонды ўтрымліваюць звесткі аб II Усерасійскім сіяністкім з'ездзе, які прайшоў у Мінску ў 1902 г., копіі пратаколаў абвінавачванняў членаў сіяністкіх суполак Бабруйскай акругі, што дае пэўнае ўяўленне аб выкарыстанні апарата Крымінальнага кодэксу РСФСР да сіяністаў [1].

2) *справаздачная дакументацыя* ўтрымлівае інфармацыю аб палажэнні сіяніцкіх моладзевых арганізацый Паўночна-Заходняй акругі, іх колькасным і ўзроставым складзе, існуючых праблемах. Найбольш інфарматыўным з'яўляецца даклад Аб'яднанай сіяніцкай арганізацыі, цэнтр якой знаходзіўся ў Гомелі [70, арк.137-139].

4. ***Мемуарныя крыніцы.*** Успаміны прадстаўнікоў даваенных яўрэйскіх абшчын гарадоў і мястэчак Браслава, Друі, Глыбокага захоўваюцца ў раённых музеях. Пры напісанні працы выкарыстоўваліся ўспаміны прадстаўнікоў яўрэйскай абшчыны, якія раней жылі ў Браславе, якія захоўваюцца ў "Браслаўскім раённым аб'яднанні музеяў" [63]. Апублікаваныя мемуары старасты Браслаўскага павета у 1923–1932 гг. Зеліслава Янушкевіча [102] утрымліваюць звесткі аб сіяніцкім руху ў мястэчку.

5. ***Перыядычны друк.*** Перыядычныя органы саюза "Хашамер Хацаір" штаба Паўночна-Заходняй акругі газеты "На смену" і "В путь" [70], інфармацыйныя бюлетэні і брашуры з'яўляюцца змястоўнымі крыніцамі, якія асвятляюць тэндэнцыі развіцця і характар дзейнасці сіяніцкіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў савецкі перыяд, а таксама раскрываюць праблемы, якія стаялі перад цэнтральным кіраўніцтвам руху і лакальнымі арганізацыямі.

У працэсе працы над дысертацыйным даследаваннем выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя метады даследавання, так і спецыяльна-гістарычныя. Да першых адносяцца аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя. Сярод спецыяльна-гістарычных метадаў выкарыстоўваліся гісторыка-параўнальны, гісторыка-статыстычны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны метады.

**Асноўныя палажэнні магістарскай дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Дыскрымінаванае становішча яўрэяў Расійскай імперыі стала галоўнай перадумовай з'яўлення ў яўрэйскім асяродку імкнення да эмансіпацыі і паспрыяла распаўсюджванню палестынафільскай ідэі на беларускіх землях. У канцы XIX ст. сфарміравалася канцэпцыя сіянізму ў аснове якога ляжала ідэя вяртання яўрэяў

свету на сваю гістарычную радзіму. Пасля таго, як была сфарміравана канцэпцыя палітычнага сіянізму,беларускае яўрэйства актыўна ўключылася ў сіяніскі рух. Ідэя духоўнага сіянізму ўпершыню была агучана у 1902 г. у Менску на Усерасійскай канферэнцыі сіяністаў. Альтэрнатывай сіянізму на беларускіх землях былі аўтанамісцкія ідэі Бунда.

2. Першыя сіяніскія гурткі належную ўвагу надавалі культурна-асветніцкай працы і нацыянальнаму выхаванню, пазней праграмна-арганізацыйная дзейнасць прыняла формы кібуцнага руху: арганізацыя падрыхтоўчай працы на аснове сацыялістычных ідэалаў. Шырокі размах руху і імкненне да рэалізацыі сіяніскіх мэт, а таксама вызначэння шляхоў па іх дасягненню прывялі да склікання Усерасійскай канферэнцыі сіяністаў у Менску ў 1902 г. Аднак актыўнае развіццё сіяніскага руху выклікала рэакцыю з боку ўлады: у 1903 г. любая сіяніская дзейнасць на тэрыторыі імперыі была забаронена.

3. Дзейнасць сіяніскіх арганізацый у грамадска-палітычнай сферы актывізавалася пасля Лютаўскай рэвалюцыі. З усталяваннем Савецкай улады сіяніскія арганізацыі апынуліся пад наглядам яўрэйскіх секцый, створаных для прасоўвання бальшавіцкіх ідэй у яўрэйскія масы. У першы паслярэвалюцыйны час сіяніскі рух не быў аднастайным і ўяўляў шырокі спектр палітычных, культурных і спартовых арганізацый, ідэалогія якіх вагалася з вялікай амплітудай і адлюстроўвала ўсе адценні і плыні яўрэйскай нацыянальнай думкі. Да 1921 г. у Савецкай Беларусі сфарміравалася адмоўнае стаўленне да сіяніскіх арганізацый з боку бальшавіцкіх уладаў, іх дзеянні вызначаліся як контррэвалюцыйныя і антыкамуністычныя.

4. З пачатку 1920-х гг. сіяніскі рух у Савецкай Беларусі апынуўся на нелегальным становішчы. Гэта адбывалася ва ўмовах, калі афіцыйна сіяніская дзейнасць забаронена не была, але расцэньвалася як злачынства. Тым не менш, да 1928 г. працягвалі існаванне прабальшавісцкія арганізацыі – легальнае крыло “Хе-Халуц” і “Папунсавей-Цыён”. Сярэдзіна і другая палова 1920-х гг. характарызавалася жорсткімі рэпрэсіямі ў дачыненні да актывістаў руху. Сіяніскія арганізацыі пачалі змяняць тактыку дзеянняў, каб працаваць у падпольных умовах,

гэта вызначалася спецыяльнымі інструкцыямі. Нелегальная дзейнасць па падрыхтоўцы рэпатрыянтаў і эміграцыя працягваліся.

5. У Заходняй Беларусі сіяніцкім партыям і арганізацыям гарантаваліся палітычныя правы і ажыццяўленне праграмна-арганізацыйных задач. Сіяністы Заходняй Беларусі былі вольныя ў арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці яўрэйскай абшчыны, заснаванні прадпрыемстваў для хахшары, адкрыцці іўрытскіх школ. Сіяніцкі рух Заходняй Беларусі не быў аднастайным. Улічваючы адрозненні партый і арганізацый у поглядах, а таксама тактыцы ў вырашэнні праграмных задач, стаўленні да рэлігіі, сіяніцкія партыі і арганізацыі можна падзяліць на радыкальныя, кансерватыўныя, ультраартадаксальныя , сацыялістычныя.

6. Сіяніцкі рух у Заходняй і Савецкай Беларусі быў падобны ў ажыццяўляемых праграмах, але умовы здзяйснення праграмных задач сіяністаў у гэтых рэгіёнах былі рознымі. Гэта тлумачылася дзеючым заканадаўствам БССР і Рэспублікі Польша. З пачатку 1920-х гг. сіяніцкі рух у Савецкай Беларусі знаходзіўся на нелегальным становішчы, а яго актывісты падвяргаліся арыштам. Калі камуністычная партыя стала дамінуючай, любая дзейнасць сіяністаў на ўнутрыпалітычнай арэне была спынена. У сіяніцкім руху як Савецкай так і Заходняй Беларусі прасочвалася канкурэнцыя паміж найбольш уплывовымі арганізацыямі, існавалі тэндэнцыі да фракцыйнасці і драблення. Сіяніцкі рух у Савецкай Беларусі у 1920-я гг. быў прадстаўлены арганізацыямі, якія дэкларавалі прынцыпы сацыялістычнага сіянізму. У першай палове 1920-х гг. у Заходняй Беларусі найбольшы ўплыў мелі ультраартадаксальныя сіяніцкія арганізацыі, з другой палове 1920-х – радыкальныя рэвізіяніцкія арганізацыі сіяністаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваны на навуковых канферэнцыях: XVIII (65) Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў “Наука – образованию, производству, экономике” (Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, 13–14 сакавіка 2014 г.), міжнародная моладзевая навукова-практычная канферэнцыя “Актуальные

проблемы отечественной и всеобщей истории" (Пскоў, Пскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, красавік 2014 г.), VI міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Віцебскія старажытнасці" (Віцебск, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, 23–24 кастрычніка 2014 г.), а таксама на круглым стале "Сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння гісторыі Беларусі XIX–пачатку XXI ст." (Мінск, 26 чэрвеня, 2014 г.).

**Апублікаванасць вынікаў**. Палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў публікацыі ў зборніку матэрыялаў XVIII (65) Рэгіянальнай навукова-практычнай канферэнцыі выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў "Наука – образованию, производству, экономике".

**Структура і аб'ём дысертацыі**. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, асноўнай часткі, якая ўключае ў сябе 3 главы, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Абвінаваўчае заключэнне па справе № 23, 1926 г. Арк. 123–125, 127 // Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі. Тэчка "Сіяніскі рух".
2. Авинери, Ш Происхождение сионизма. Основные направления в еврейской политической мысли / Ш. Авинери. – М: Мосты Культуры, 2004. – 479 с.
3. Авторханов, А.Г. Империя Кремля. Советский тип колониализма / А.Г. Авторханов. – Минск: «Полифакт», 1991. – 107 с.
4. Арарат, Н. Еврейство и сионизм: Лекции по истории народа Израиля и Государства Израиль / Н. Арарат; ред. И. Лурье, пер. с иврита Е. Константиновская. – Иерусалим, 1992. – 192 с.
5. Архив еврейской истории / Международный исследовательский центр российского и восточноевропейского еврейства; гл. Ред. О.В. Будницкий. Т. 3. – М.: РОССПЭН, 2006. – 408 с.
6. Архив еврейской истории / Международный исследовательский центр российского и восточноевропейского еврейства; гл. Ред. О. В. Будницкий. Т. 5. – М.: РОССПЭН, 2008. – 367 с.
7. Базельская программа // Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eleven.co.il/article/10376/. – Дата доступа: 20.01.2015.
8. Бальфура Декларация // Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eleven.co.il/article/10390/. – Дата доступа : 20.01.2015.
9. Басин, Я. Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е гг. Исторические очерки / Я. Басин. – Минск: А.Н. Вараксин, 2008. – 302 с.
10. Беленькая, Л. Наперекор: Еврейское национальное движение в СССР и его идеология (1945–1976) / Л. Беленькая, Б. Зингер. – Минск: Мет, 2004. – 382 с.
11. Бен-Гурион, Д. Задачи еврейской революции / Д. Бен-Гурион // Сионизм в контексте истории: хрестоматия по истории сионизма с предисловием

А. Херцберга. В 2 кн. Кн. 2. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1993. – С. 340–363.

12.Бен-Иехуда, Э. Письмо издателю газеты «Ха-шахар» / Э. Бен-Иехуда // Сионизм в контексте истории: хрестоматия по истории сионизма с предисловием А. Херцберга. В 2 кн. – Кн. 1. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1993. – С. 221–229.

13.Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового завета в русском переводе с параллельными местами и приложениями. – Чикаго: SGP, 1990. – 1217 с.

14.Биншток, В. Естественное движение еврейского населения в СССР за 1924–26 годы. / В. Бинншток, С. Новосельский // Евреи в СССР. – Вып. IV. Изд. Правления Всероссийского ОРТ. – М, 1929. – С. 73–76.

15.Бруцкус, Б. Еврейское население под коммунистической властью / Б. Бруцкус // Евреи и русская революция: материалы и исследования. – М.– Иерусалим, 1999. – С. 293–319.

16.Бэмпард, Э. Ідышысцкі эксперымент у савецкім Менску / Э. Бэмпард // ARCHE. – 2007. – № 11. – С. 61–80.

17.Воробьев, А. Национальные еврейские организации на выборах во Всероссийское Учредительное собрание в Могилевской губернии / А. Воробьев // Евреи Беларуси: История и культура. – Вып. 5. – Минск: Четыре четверти, 2000. – С. 76–78.

18.Герасимова, И. П. К вопросу белорусско-еврейских отношений в период становления белорусской национальной государственности (по материалам прессы 1917–1922 гг.) / И.П. Герасимова // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 201–205

19.Герасимова, И.П. Взгляд через 100 лет. Конференция сионистов в Минске / И.П. Герасимова // Мишпоха. – 2002. – № 11 (1). – С. 11–19.

20.Герасімава, І. Аб жыцці яўрэйскай абшчыны у Бабруйску // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Бабруйска. – Мінск: Выш. школа, 1995. С. 143-152.
21.Герцль, Т. Еврейское государство: Попытка современного решения еврейского вопроса / Т. Герцль; пер. С нем. – СПб.: Тип. М. Стасюлевича, 1896. – 104 с.
22.Герцль, Т. Полное собрание речей и статей о сионизме / Т. Герцль; пер. С нем. Под ред. Л. Паперина; Издание Книгоизд-ва Т-ва "Гашахар" в г. Белостоке. – СПб.: Типо-литогр. "Энергия", 1905. – 301 с.
23.Горький, М. О еврейском народе / М. Горький. – Иерусалим, 1986. – 172 с.
24.Государственные преступления // Уголовный кодекс РСФСР. 1922 г. – Отдельная часть. – Гл. I. – Ст. 61, 72.
25.Декрет Совета Народных Комиссаров "Об отделении церкви от государства и школы от церкви" // Сайт конституции Российской Федерации [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://constitution.garant.ru/history/act1600-1918/5325/. Дата доступа: 15.02.2015.
26.Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 346. – Арк 2.
27.ДАВВ. – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 346. – Арк 94.
28.ДАВВ. – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 346. – Арк 96.
29.ДАВВ. – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 346. – Арк 119.
30.ДАВВ. – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 347. – Арк 107.
31.ДАВВ. – Ф.10050-п. Воп. 1. Спр. 347. – Арк 111.
32.Документы внешней политики СССР. Т. 3: 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. / под ред. Г.А. Белова и др. – М.: Гос. Изд. Полит. Лит., 1959. – С.619–658.
33.Дубнов, С.М. Две концепции национального еврейского возрождения / С. М. Дубнов, Б.Ц. Динур; под. Ред Н. Прат. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1993. – 378 с.

34.Евреи борьбы: Еврейское национальное движение в Советском Союзе. 1967–1989. Каталог выставки / ред. Р. Шнольд. – Тель-Авив: Бейт ха-Тфуцот, 2007. – 160 с.
35.Замойский, А. Еврейская молодежь местечек Советской Белоруссии / А. Замойский // Беларусь у XX стагоддзі. – Вып. 2. – Мінск: [Томск], 2003. – С. 100–105.
36.Зельцер, А. Евреи советской провинции: Витебск и местечки. 1917–1941. / А. Зельцер. – М.: РОССПЭН, 2006. – 476 с.
37.Игал, И. От мечты к были: Центральные проблемы в истории сионизма / И. Игал. – Б. м.: Изд-во Мин-ва обороны Израиля, 1991. – 127 с.
38.Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси / Э.Г. Иоффе. – Минск: "АРТИ-ФЕКС", 1996. – С. 72–208.
39.Иоффе, Э.Г. Деятельность организации «Хашомер-Хацаир» в Беларуси (1924–1926) и создание кибуца в Палестине / Э.Г. Иоффе // Форум. Информационно-культурный бюллетень. – 1996. – №4. – С. 41–45.
40.История еврейского национального движения 1870–1914: учебник для среднего и старшего школьного возраста. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1994. – 196 с.
41.Канстытуцыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 1919 г. // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// http://www.pravo.by/main.aspx?guid=2041/. – Дата доступа: 17.01.2015.
42.Кельнер, В. С.М. Дубнов: от исторических иллюзий к исторической действительности / В. Кельнер // Мировой кризис 1914–1920 годов и судьба восточноевропейского еврейства. – М.: РОССПЭН, 2005. – С. 288–301.
43.Книга о русском еврействе: 1917–1967 / под ред. Я. Фрумкина, Г. Аронсона, А. Гольденвейзера. – Иерусалим: Гешарим; М.: Мосты культуры; Минск: МЕТ, 2002. – 480 с.

44.Книга о русском еврействе: от 1860-х годов до революции 1917 г. – Иерусалим: Гешарим; М.: Мосты культуры; Минск: МЕТ, 2002. – 600 с.
45.Конституция (основной закон) Белорусской Советской Социалистической Республики 1937 г. // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=2061/. – Дата доступа: 17.01.2015.
46.Конституция Белорусской Социалистической Советской Республики 1927 г. // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=2051/. Дата доступа: 17.01.2015.
47.Костючик, В. Бунд в политической жизни Польши в межвоенный период (20–30 годы) / В. Костючик // Моладзь Берасцейшчыны: Сборник научных статей студентов исторического факультета Брестского государственного университета имени А. С. Пушкина. – Вып. 2. – Брест: Изд-во БрГУ,1995. – С. 62–68.
48.Котовенко, А. Сионистские молодежные организации социалистического толка в Гомеле в 1920-е гг. / А. Котовенко // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 3. – Мінск: [Томск], 2004. – С. 121–129.
49.Кошаровский, Ю. Мы снова евреи: Очерки по истории сионистского движения в Светстком Союзе / Ю. Кошаровский. – Т. 1. – Иерусалим, 2007. – 444 с.
50.Крапивин, М. Большевики и сионисты: история взаимоотношений в послеоктябрьский период / М. Крапивин. – Волгоград: Перемена, 1995. – 120 с.
51.Краткая еврейская энциклопедия. Т. 1–11, дополнения I–III. – Иерусалим, 1976–2005.
52.Кухаревич, Е. Население отдельных национальностей по полу, возрасту, состоянию в браке, образованию, источникам средств к существованию,

лингвистическим признакам / Е. Кухаревич // Бюллютень БелСтат. – Минск: Изд.БелСтат. – 2010. – 60 с.

53. Лейзеров, А. Неизученные страницы истории. Еврейские национальные Советы в Белоруссии (20-е – 30-е гг.) / А. Лейзеров // Мишпоха – 1995. – №5. – С. 88–89.

54. Ленин, В. Законопроект о национальном равноправии: Проект закона об отмене всех ограничений прав евреев и всех вообще ограничений, связанных с происхождением или принадлежностью к какой бы то ни было национальности / В. Ленин // Ленин, В.И. Соч. – Т. 20. – М.: Госполитиздат, 1952. – С. 153–154.

55. Лопухин, А. Сионизм. Исторический очерк его развития / А. Лопухин; Департамент Полиции // Санкт-Петербург: Типография Министерства Внутренних Дел, 1903. – 149 с.

56. Луз, Э. Пересекающиеся параллели: Религия и национальная идея в эпоху формирования сионистского движения в Восточной Европе (1882–1904) / Э. Луз; сокращ. Пер. С иврита Е. Жидкова. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1991. –378 с.

57. Мазец, В. Евреи Советской Белоруссии в межвоенный период / В. Мазец, Э. Иоффе // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 3. – Мінск, 2004. – С. 162–169.

58. Маор, И. Сионистское движение в России / И. Маор. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1977. – 454 с.

59. Марголин, Ю. Как было ликвидировано сионистское движение в Советской России / Ю. Марголин. – Иерусалим: Маоз, 1968. – 22 с.

60. Минова, Н. Проблема антисемитизма в межнациональных отношениях на Гомельщине в 20-30 гг. XX в. / Н. Минова // Евреи Беларуси: История и культура: сб. научн. Тр. – Вып. VI / сост.-ред. И. Герасимова. – Минск: Четыре четверти, 2001. – 280 с.

61. Минск – город и мать: в 2 т. / ред. Шломо Эвен-Шошан. – Тель-Авив: Дом борцов гетто им. Ицхока Каценельсона, 1975. – Т.1. – 344 с.

62.Мировой кризис 1914–1920 годов и судьба восточноевропейского еврейства / отв. Ред. О.В. Будницкий. – М.: РОССПЭН, 2005. – 448 с.
63.Мой парушаны дом / Рукапісны пераклад з мовы ідыш Бокмана-Бандта часткі «Кнігі памяці». – Іерусалім. – 1996. – 56 с. // Навукова-даследчая ўстанова культуры “Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў”. Тэчка “Яўрэйская абшчына Браслава”.
64.Мощук, А. К вопросу о взаимоотношениях Бунда и Польской социалистической партии на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / А. Мощук // Материалы Десятой Ежегодной Междунар. Междисциплин. Конф. По иудаике. – Ч. 1. Академическая серия. Вып. 12. – М.: Центр «Сэфер»,2003. – С. 123–132.
65.Мощук, А. Польский Бунд – между социал-демократией и большевизмом / А. Мощук // Материалы Одиннадцатой Ежегодной Ежегодной Междунар. Междисциплин. Конф. По иудаике. – Ч. 1. Академическая серия. Вып. 16. – М.: Центр «Сэфер», 2004. – С. 241–251.
66.Мы начинали еще в России: воспоминания / сост. И. Эрез. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1990. – 409 с.
67.Мярчук, В.М. Яўрэйская эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Палястыну ў 1921–1939 гг. / В.М. Мярчук // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. – 2014. – Сер. 1. № 2(174). С. 18–24.
68.Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф.4-п. Воп. 1. Спр. 1892. – 43 арк.
69.НАРБ. – Ф.4-п. Воп. 1. Спр. 1893. – 555 арк.
70.НАРБ. – Ф.4-п. Воп. 1. Спр. 2413. – 441 арк.
71.НАРБ. – Ф.4-п. Воп. 1. Спр. 15637. – 63 арк.
72.Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАБ). – Ф. 300. Воп. 1. – Арк. 162.
73.НГАБ. – Ф. 295. Воп. 2. Спр. 1708. Арк. 65.
74.НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6459. Арк. 1–2.

75.Подлипский, А. Евреи в Витебске. В 2 т. Т. 1 / А. Подлипский – Витебск: Витебск. обл. тип., 2004. – 184 с.
76.Политические партии Польши, Западной Белоруссии и Западной Украины. – Минск: Издательство АН БССР, 1935. – 335 с.
77.Раманава, І. Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны перыяд / І. Раманава // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. – Мінск: "Дэполис", 2001. – С. 277–232.
78.Редлих, Ш. Еврейские организации в СССР: евсекции и Еврейский Антифашистский комитет (сравнительный анализ) / Ш. Редлих // Исторические судьбы евреев в России и СССР: начало диалога. – М.: Еврейское историческое об-во, 1992 – С. 200–208.
79.Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. Работ / Сост. И. Кузнецов, Я. Басин; науч. Ред. В П. Андреев. – Вып. 2. – Минск: Мемориал, 2007. – 376 с.
80.Российский государственный архив социально-политической истории. – Ф. 445. Воп. 1. Спр. 180. Арк. 148
81.Российский сионизм: История и культура. Материалы научной конференции / ред. О.В. Будницкий, Р. Капланов, А. Локшин, В. Мочалова, Д.И. Рубина. – М.: Дом еврейской книги, 2002. – 328 с.
82.Сарочык, В.Л. Дзейнасць яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый на тэрыторыі Наваградскага ваяводства (1926 – 1939 гг.) / В.Л.Сарочык // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зборнік навук. Артыкулаў / Гродз.дзярж. ун-т; рэдкалегія: І.П. Крэнь, І.В. Соркіна (адк. Рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2007. – С. 212–216.
83.Сарочык, В.Л. Яўрэйскія палітычныя партыі ў Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. / В. Л. Сарочык // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў : зборнік навук. Артыкулаў. — Гродна: ГрДу, 2008. – С. 188–196.
84.Свирид, А. Н. Еврейская социалистическая рабочая партия «Poalej cjon» в Полесском воеводстве / А.Н. Свирид // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблема

развіцця заходняга рэгіена Беларусі: матэрыялы міжнар. навукова-практ. Канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г.: у 2 ч. – Брэст: Выдавецтва С. Лаўрова. – 1998. – Ч. 2. – С. 168–173.

85.Свирид, А.Н. Еврейская ортодоксальная партия «Агудат Израэль» и еврейское политическое движение во II Речи Посполитой (1919–1939 гг.) / А.Н. Свирид // Моладзь Берасцейшчыны: зборнік студэнцк. Навук. Прац. – Брэст: БрГу, 1997. – С. 30–37.

86.Свирид, А.Н. Сионистская партия труда «Hitachuuth» («Объединение») во II Речи Посполитой с момента образования до государственного переворота 1926 г. / А.Н. Свирид // Моладзь Берасцейшчыны: зборнік студэнцк. Навук. Прац.– Вып. 2. – Брест, Изд. БрГу, 1995. – С. 69–75.

87.Симонова, А. Сионистское движение в советской России в 20-е годы / А. Симонова // Российский сионизм: история и культура. – М.: Дом еврейской книги, 2002. – С.278–287.

88.Сионизм в контексте истории: хрестоматия по истории сионизма с предисловием А. Херцберга. В 2 кн. – Кн. 1. – Иерусалим: Библиотека-Алия, 1993. –392 с.

89.Сионизм в Могилёве // Могилёв еврейский [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.jewish-mohilev.org/istoriya-evreev-mogileva.html/. – Дата доступа: 27.11.2014.

90.Скир, А. Еврейская духовная культура в Беларуси: историко-литературный очерк / А. Скир. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 144 с.

91.Смиловицкий Л. Л. Сионистский след в Турове // Репрессивная политика советской власти в Беларуси : сборник научных работ. — Мн.: Мемориал, 2007. — В. 3. — С. 264—294.

92.Стецкевич, П.Т. Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.): монография / П.Т. Стецкевич. – Гродно: ГГАУ, 2010. – 190 с.

93.Томашевич, В.М. Зарождение и развитие сионизма в северо-западных губерниях Российской империи (начало 80-х гг. XIX в. – 1907 г.) : автореф. Дис. … канд. ист. наук: 07.00.03 / В.М. Томашевич; Белорус. Гос. ун-т. – Минск, 2003. – 22 с.

94.Успаміны П.М. Серабракова // Бабруйскі краязнаўчы музей. Навуковы архіў № 96. – Арк. 6–8.

95.Ховевей Цион // Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eleven.co.il/article/14536. – Дата доступа: 20.01.2015.

96.Шевелев, Д. Осмотр развития еврейских исследований в Беларуси на границе XX–XXI вв. / Д. Шевелев // Беларускі гістарычны агляд: навуковы часопіс. – Снежань 2003. – Т. 10. – Сшытак 1–2 (18–19). – С. 188–200.

97.Шепетюк, В.В. Из истории сионистского движения в г. Пинске (конец 20–х годов XX в.) / В.В. Шепетюк // Моладзь Берасцейшчыны: зборнік студэнцк. Навук. Прац. – Брэст: Изд. БрГу. 1997.

98.Штейн, И. Всероссийский съезд сионистов в Минске / И. Штейн // Сионистское обозрение. – Елисаветград, 1902. – № 6. – С. 30.

99.Щука, О.Л. Деятельность молодёжных сионистских организаций на территории Западной Беларуси в межвоенный период / О.Л. Щука // Материалы XVI Ежегодной междунар. Междисцип. Конф. По иудаике, Москва, 3–5 февр. 2009 г.: в 3 ч. – М.: Сэфер, 2009. – Ч. 3. – С. 148–153.

100. Щука, О.Л. Общественно-политическая деятельность еврейских партий и организаций в Западной Беларуси (1926–1939 гг.): автореф. Дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / О.Л. Щука; Бел. Гос. пед. Ун-т им. М. Танка. – Минск, 2015. – 26 с.

101. Holzer, J. Mozaika polityczna II Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1974. – 670 s.

102. Januszkiewicz, Z. Moje wspomnienia (Braslaw 1923 – 1932 r. Bielsk Podlaski 1933-39 r.) / Z. Januszkiewicz. – Warszawa, 1995. – 312 s.

103. Lewicka, A. Status formalnoprawny żydowskich gmin wyznaniowych w II Rzeczypospolitej / A. Lewicka // Almanach Studia Żydowskie. – 2012. – № 2. – S. 31–60.

104. Pawłowski, S. 0 emigracji zydow z polski i o ich kolonizacji. Odbitka z zeszytu 1–2/1937 Spraw Morskich i Kolonialnych / S. Pawłowski. – Warszawa: Biblioteka Polska, 1937. – 64 s.

105. Syjonizm w Polsce a kwestie polityki palestyńskiej // Lauder dzieje Żydów [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// http://www.lauder.pl/syjonizm-w-polsce-a-kwestie-polityki-palestynskiej. – Дата доступа: 01.02.2015.

106. Tomaszewski, J. Zarys dziejów żydów w Polsce w latach 1918–1939 / J. Tomaszewski. – Warszawa, 1990. – 114 s.

107. Tomaszewski, J. Żydzi w Polsce. Dzieje i kultura. Leksykon / J. Tomaszewski. – Warszawa: Wydawnictwo cyklady, 2001. – 572 s.

108. Wołkonowski, J. Stosunki polsko-żydowskie w Wilnie i na Wileńszczyźnie 1919-1939 / J. Wołkonowski. – Białystok, 2004. – 463 s.